# Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

Цана 2 кап.

№ 19 (925) Май, 1966 г.

Год выдання 11-ы




Чалавека нельга прымусіць смяяцца. Калі радасць унутры, яна і ў вачах, і на вуснах. А яна ёсць у гэтых людзей, якіх вы бачыце на здымку. І самая галоўная прычына іх радасці—яны жывуць на Радзіме. Пётр ШЧЭРБА (першы злева), яго жонка Марыя, унучка Іра, Галіна і Канстанцін КУТАСЫ—мінчане. Трое з іх—Пётр, Марыя і Канстанцін—шмат год былі ў Аргенціне. Як яны і іншыя рээмігранты з Аргенціны ўладкаваліся на Радзіме, як жывуць, мы расказваем сёння на 4-й і 5-й старонках нашай газеты.

Фота А. САСІНОЎСКАГА.

У АБСТАНОЎЦЫ палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага рашэннямі XXIII з'езду КПСС, ідзе падрыхтоўка да дня выбараў у Вярхоўны Савет СССР — вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў нашай краіне.

Паўсямесна — на заводах і фабрыках, у калгасах і саўгасах — кандыдатамі ў дэпутаты названы самыя дастойныя сыны і дочкі савецкага народа—выдатныя дзеячы партыі і дзяржавы, перадавікі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, вядомыя пісьменнікі, вучоныя.

У калгасе «XVII партз'езд» Столінскага раёна славіцца сваёй ударнай працай звеннявая Ксенія Якаўлеўна Кляцун. Хлебаробы ведаюць яе і як чулага таварыша, добрага дарадчыка. І таму зразумела, чаму яны аднадушна назвалі Ксенію Кляцун сваім кандыдатам у дэпутаты. Лепшую шліфавальшчыцу цэха лесавозаў Ганну Іванаўну Ясючэня вылучылі кандыдатам у дэпутаты вышэйшага органа ўлады мінскія аўтамабілебудаўнікі. Сярод названых кандыдатаў у дэпутаты перадавая калгасніца сельгасарцелі імя Свярдлова Горацкага раёна Марыя Уладзіміраўна Цітова, даярка саўгаса «Азярцы» Глыбоцкага раёна Ядзвіга Казіміраўна Садоўская, старшы аператар атмасферна-вакуумнай трубчаткі Полацкага нафтаперапрацоўчага завода Аркадзь Сцяпанавіч Казлоў.

Высокае давер'е народа, яго любоў і павагу заваёўвае той, хто, не шкадуючы сіл, творча працуе на сваім участку, ніколі не спыняецца на дасягнутым, няспынна шукае шляхі для паляпшэння прадукцыйнасці працы, хто актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці.

З кожным днём шырыцца выбарчая кампанія. Яна праходзіць пад знакам непарушнага адзінства партыі і народа. Духам гэтага адзінства і згуртаванасці, арганічна характэрным нашаму грамадству, і прасякнут Зварот Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза да ўсіх выбаршчыкаў — рабочых і работніц, сялян і сялянак, савецкай інтэлігенцыі, да воінаў Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. У гэтым важным перадвыбарным дакуменце партыя шчыра, ад усяго сэрца дзеліцца з народам сваімі самымі запаветнымі думкамі і планамі на будучае, чотка і ясна выкладае змест сваёй унутранай і знешняй палітыкі.

З новымі поспехамі ідзе наш народ насустрач выбарам. Яму ёсць чым ганарыцца і радавацца. Ды і як не радавацца, скажам, таму, што наша Айчына цяпер займае другое месца ў свеце па агульнаму аб'ёму прамысловай прадукцыі, што на яе долю прыходзіцца амаль пятая частка ўсёй сусветнай прамысловай прадукцыі.

Расце вытворчасць тавараў народнага спажывання. У 1965 годзе ў Савецкім Саюзе выпрацавана больш як дзевяць мільярдаў пагонных метраў тканін, 486 мільёнаў пар абутку. Значна павялічыўся выпуск радыёпрыёмнікаў, тэлевізараў, халадзільнікаў і іншых тавараў.

Павялічылася вытворчасць і прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Значны крок наперад зрабілі савецкая навука і культура.

У Звароце да выбаршчыкаў партыя з ленінскай праматой гаворыць і аб нашых недахопах, цяжкасцях, аб нявырашаных задачах, заклікае савецкіх людзей на новыя здзяйсненні.

Савецкі Саюз — шматнацыянальная дзяржава. Адна з найвялікшых заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі, наша гордасць і наша сіла — гэта стварэнне сапраўды брацкага саюза ўсіх нацый і нацыянальнасцей. І таму цалкам зразумела, чаму знаходзяць ва ўсіх савецкіх людзей гарачы водгук словы Звароту партыі—мацаваць дружбу народаў.

Адну з галоўнейшых сваіх задач партыя бачыць у тым, каб нястомна ўмацоўваць Савецкую дзяржаву, развіваць і ўдасканальваць сацыялістычную дэмакратыю.

У савецкіх людзей знаходзіць поўную падтрымку знешняя палітыка партыі, накіраваная на ўмацаванне трывалага міру на планеце.

Усё ў імя чалавека, усё для чалавека — вось генеральная лінія нашай партыі. Савецкія людзі цвёрда ведаюць, што партыя заўсёды з імі, яна іх мудры рулявы.

Па ўсёй краіне гучаць сёння словы ЦК КПСС да выбаршчыкаў:

— Усе на выбары!

На гэты заклік увесь савецкі народ адкажа аднадушным выбраннем кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных.

# ПАДЗЕІ • ЛЮДЗІ • ФАКТЫ

ПАДЗЕІ • ЛЮДЗІ • ФАКТЫ

### МІНСК

Выканаўчы камітэт гарадскога Савета дэпутатаў працоўных вырашыў увекавечыць у назве адной з вуліц імя Героя Савецкага Саюза, загінуўшага ў Вялікай Айчыннай вайне, Л. Н. Гурцьева.

●

Кожны дзень з пад'язных пуцей Гомельскага суперфасфатнага завода ва ўсе канцы краіны адпраўляюцца цыстэрны з прадукцыяй прадпрыемства — сернай кіслатой.




**НА ЗДЫМКУ:** эшалон з сернай кіслатой перад адпраўкай.

Фота **Ч. Мезіна.**

●

Калектыў саўгаса «Камунар» Гомельскага раёна завяршыў сяўбу ранніх збожжаных. Зараз ідзе пасадка бульбы.



Фота **В. Лупейкі.**

### МАСКВА

3 мая 1966 года споўніўся месяц з таго моманту, калі штучная станцыя «Месяц-10» была выведзена на калямесяцавую арбіту і стала першым у свеце штучным спадарожнікам Месяца. За гэты перыяд станцыя зрабіла 244 віткі вакол Месяца, праляцеўшы больш 3,5 мільёна кіламетраў. Са станцыяй ажыццёўлена 139 сеансаў сувязі. Бартавая апаратура і сістэмы спадарожніка працуюць нармальна. Аналіз інфармацыі, атрыманай ад навуковых прыбораў, устаноўленых на борце спадарожніка, дазволіў зрабіць першыя папярэднія вывады аб складзе парод месяцавай паверхні, радыяцыйнай абстаноўцы і магнітных з'явах у калямесяцавай прасторы. Далейшыя навуковыя даследаванні з дапамогай штучнага спадарожніка Месяца будуць праводзіцца ў адпаведнасці з праграмай.

### ГОМЕЛЬ

Абласны рускі драматычны тэатр правёў агляд творчасці моладзі, арганізаваны Беларускім тэатральным аб'яднаннем. Маладыя акцёры падрыхтавалі да агляду лепшыя саае работы, паказалі прадстаўнікам грамадскасці і членам журы ўрыўкі са спектакляў, у якіх яны заняты, а таксама выступілі ў тых ролях, якія яны хацелі б іграць у спектаклях тэатра.

### ЕРЭВАН

У высакагорнай Бюраканскай абсерваторыі прахозіў міжнародны сімпозіум астрафізікаў. На сімпозіум сабраліся даследчыкі космасу з чатырнаццаці краін. Вучоныя-астрафізікі абмяняліся думкамі і абмеркавалі вялікую колькасць цікавых праблем, якія звязаны з вывучэннем актыўных працэсаў, што адбываюцца ў ядрах далёкіх галактык.

### БУДА-КАШАЛЁВА

Да гэтага года сады ў саўгасе «Чырвонакастрычніцкі» займалі каля трохсот сарака гектараў, а сёлетняй вясной плошча пад імі павялічылася яшчэ на сто дваццаць. У саўгасе плануюць далейшае пашырэнне садовай зоны — да шасцісот пяцідзесяці гектараў. Для перапрацоўкі пладоў і ягад саўгас будуе ўласны завод.

### ЕЛЬСК

Расце і прыгажэе вёска Дабрынь. Уздоўж прасторнай вуліцы выстраіліся васьмігадовая школа, урачэбны ўчастак, сельскі клуб, бібліятэка, сталовая, магазіны, прасторныя і светлыя дамы хлебаробаў. А будаўніцтва працягваецца. Толькі што справілі наваселле сем'і трактарыста Віктара Уласава, шафёра Мікалая Трошкі, пастуха Леаніда Нажынскага і іншых.

## БРАЦКАЯ ДАПАМОГА ПРАЦОЎНЫМ ТАШКЕНТА

Калектывы прамысловых прадпрыемстваў Савецкай Беларусі аказваюць шчырую дапамогу працоўным Ташкента ў хутчэйшым аднаўленні горада, які пацярпеў ад землятрасення. У адрас сталіцы Узбекістана ўжо адгружана рэспубліканскай канторай «Белбудснабзбыту» 15 тысяч квадратных метраў сухой тынкоўкі, каля 15 тысяч квадратных метраў патоўшчанага аконнага шкла, 72 вентылятары вытворчасці Баранавіцкага завода гандлёвага машынабудавання.

Работнікі лясной прамысловасці рэспублікі выдзелілі для будаўнікоў Ташкента некалькі вагонаў з піламатэрыяламі і круглым лесам.

У бліжэйшыя дні вылятаюць у Ташкент прадстаўнікі Міністэрства будаўніцтва БССР для вызначэння на месцы мерапрыемстваў па канкрэтнай дапамозе, якую работнікі будаўнічай індустрыі Беларусі змогуць аказаць брацкаму узбекскаму народу.

✦

ДАМАСК. Савет Міністраў Сірыйскай Арабскай Рэспублікі ратыфікаваў пратакол аб супрацоўніцтве ў будаўніцтве плаціны і гідраэлектрастанцыі на Еўфраце, падпісаны ў Маскве ў выніку перагавораў сірыйскай урадавай дэлегацыі з Савецкім урадам.

✦

ВАШЫНГТОН. Камісія па справах узброеных сіл палаты прадстаўнікоў амерыканскага кангрэсу вырашыла выдзеліць на аснашчэнне амерыканскіх узброеных сіл ваеннай тэхнікай на 931 100 000 долараў больш, чым прасіў урад у прапанаваным ім ваенным бюджэце на 1967 фінансавы год. Дадатковыя сродкі прызначаюцца на будаўніцтва двух атамных фрэгатаў, узброеных кіруемымі рэактыўнымі снарадамі, на стварэнне антыракетнай сістэмы «Ніке-Х», звышсучаснага самалёта і кіруемай чалавекам арбітальнай касмічнай лабараторыі.

✦

ХАНОЙ. Падраздзяленні Арміі вызвалення атакавалі ў правінцыі Зіялай узлётнае поле амерыканскай авіябазы Плейку—адной з буйнейшых у Паўднёвым В'етнаме. У выніку налёту знішчана больш як 40 амерыканскіх самалётаў розных тыпаў, 11 абаронных умацаванняў, забіта і ранена 380 салдат і афіцэраў праціўніка.

✦

БОН. Некалькі тысяч людзей, якія сабраліся на вуліцах невялікага заходнегерманскага гарадка Хорста, былі сведкамі таго, як на ўскраіне ў непасрэднай блізкасці ад аднаго з сялянскіх двароў узарвалася бомба, якая ўпала з англійскага бамбардзіроўшчыка «Канбера». Чалавечых ахвяр па шчаслівому выпадку не было. Была папсавана страха дома і павыбівана шкло ў вокнах.

✦

АДЗІС-АБЕБА. У сталіцы Эфіопіі завершана работа канферэнцыі ўсходнеафрыканскіх краін. У ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі Эфіопіі, Танзаніі, Кеніі, Замбіі, Малаві, Бурундзі і вострава Маўрыкій. Удзельнікі канферэнцыі выпрацавалі і падпісалі пагадненне аб стварэнні эканамічнага таварыства Усходняй Афрыкі.

## СЕГОДНЯ В НОМЕРЕ

### ДЛЯ ТЕХ, КТО НЕ ЧИТАЕТ ПО-БЕЛОРУССКИ

Передовая статья сегодняшнего номера **«ЗА ШЧАСЦЕ НАРОДА»** посвящена предстоящим выборам в Верховный Совет СССР — высший орган государственной власти в нашей стране. Кандидатами в депутаты советские люди называют самых достойных сыновей и дочерей нашего народа. В Обращении ЦК КПСС ко всем избирателям партия делится с народом самыми заветными мыслями и планами, четко и ясно излагает суть своей внутренней и внешней политики.

На 2 стр. выступает министр мелиорации и водного хозяйства Белорусской ССР А. Алексанкин — **«БАГАЦЦІ БЕЛАРУСКІХ ТАРФЯНІКАЎ».** За пятилетку в нашей стране будет осушено 6,5 миллиона гектаров переувлажненных и заболоченных земель, и почти четверть их приходится на территорию республики. Белорусские торфяники таят в себе несметные богатства. Осушенные, они ежегодно будут дополнительно давать около миллиона тонн зерна, свыше двух миллионов тон картофеля, 400 тысяч тонн овощей, не менее двух миллионов тонн сена и много другой продукции.

80-летию со дня рождения Змитрока Бядули посвящена статья **«ЛЮБЛЮ БЯСКОНЦА МАТКУ БЕЛАРУСЬ»** (6 стр.). Змитрок Бядуля (Самуил Ефимович Плавник) родился в местечке Посадец бывшего Вилейского уезда в бедной еврейской семье. Его первый рассказ на белорусском языке «Поют ночлежники» был напечатан в газете «Наша ніва» в 1910 году. В последующие годы один за другим появляются его рассказы, стихи. Но лучшие свои произведения Бядуля написал в годы Советской власти — поэмы «Беларусь», «В Ясных Крушнях», повесть «Соловей», роман «Язеп Крушинский» и др. Богатое литературное наследие этого глубоко национального белорусского писателя волнует нас жизненной правдой и большой человечностью.

Поэтов так называемого «чистого звука» брали на свое вооружение реакционеры еще в XIX веке. Но лучшие представители русской и белорусской литературы всегда видели назначение поэзии в том, чтобы «глаголом жечь сердца людей». Трудно сказать, как классифицировали себя рифмоплеты, печатавшиеся в годы оккупации в газете «Новы шлях», издаваемой гитлеровцами в Минске, — называли ли они себя поэтами «чистого звука» или просто фашистскими прислужниками, но их стихи, призывающие к капитуляции перед врагом, нужны были оккупантам так же, как и полицейская дубинка (**«ДЗЕ Ж ТОЙ «ЧЫСТЫ ГУК»!»,** 7 стр.).

Если пограничный Брест называют западными воротами страны, то Брестская таможня — своеобразный барометр, показывающий рост технического прогресса СССР. Наряду с сырьем Советский Союз экспортирует оборудование для заводов и электростанций, тракторы, автомобили, часы, холодильники и многие другие товары. Через Брестскую перевалочную базу идут в нашу страну и разнообразные импортные грузы: из Чехословакии — обувь, из ГДР — мебель, из Польши — оборудование и т. д. Работе Брестской таможни посвящена статья **«ПРАЗ ЗАХОДНІЯ ВАРОТЫ КРАІНЫ»** (7 стр.).

Крепкая интернациональная дружба связывает рабочих минского завода имени Кирова и трудящихся немецкого города Рула. Родилась эта дружба еще в двадцатые годы, когда рабочие коллективы двух городов обменялись красными знаменами. **«ЛЁС ДВУХ СЦЯГОЎ»** (8 стр.) — это рассказ о том, как белорусские и немецкие трудящиеся через огненные годы войны пронесли знамя интернационализма и международной рабочей солидарности.

Весенний репортаж из Березинского заповедника ведет натуралист В. Буторов. После зимней стужи жадно впитывает земля теплые солнечные лучи, в новый зеленый наряд оделись леса и луга, разноголосым щебетаньем наполнились заповедные угодья, из-под коры и гнилых пней выползают насекомые, готовится к нересту рыба, проснулся голодный хозяин ельника — медведь. Пришла долгожданная весна (**«ЛІРЫКА ВЯСНЫ»,** 8 стр.).

# НЕ ПАГАСНЕ ПАМЯЦЬ НАРОДНАЯ

Заліты сонцам поўдзень майскага дня. Над плошчай Перамогі гучаць урачыстыя мелодыі гімнаў Савецкага Саюза и Беларускай ССР. У памяць аб тых, хто аддаў сваё жыццё за мірнае сонца над Радзімай, за шчаслівыя ўсмешкі дзяцей, за светлую і радасную працу, узлятае над вечным агнём, ля якога застыла ганаровая воінская варта, урачыстае і гераічнае «Слаўся» Глінкі.

Тысячы мінчан сабраліся ля помніка-абеліска воінам Савецкай Арміі і партызанам Беларусі, якія загінулі ў баях за вызваленне нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яркую зеляніну вянкоў, шматквецце букетаў прынеслі яны сюды ў гадавіну знамянальнай перамогі.

Да падножжа велічнага абеліска ўскладаюцца вянкі ад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў рэспублікі, ад камандавання і воінаў Беларускай ваеннай акругі.

З трох бакоў сцякаюцца да абеліска перамогі калоны прадстаўнікоў калектываў заводаў, фабрык, вну, школ, будаўнічых арганізацый, установ. Граніт помніка патанае ў кветках.

Вянкі ўскладаюць кіруючыя работнікі ЦК КПБ, Савета Міністраў і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, абкома КПБ, гаркома і райкомаў КПБ, выканкомаў абласнога, гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных, дэлегацыі ад прадпрыемстваў сталіцы. Ахопленыя пачуццём інтэрнацыянальнай салідарнасці, кветкі неўміручым героям прынеслі дэлегацыі кубінскіх, в'етнамскіх, самалійскіх і іншых замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў Мінску.

У гэты дзень кветкі былі ўскладзены да помнікаў героям Айчыннай вайны, ля месц пахавання ахвяр фашызму, на месцах дзеянняў і смерці партызан і падпольшчыкаў, ля магіл невядомых салдат.

Цікавыя сустрэчы з былымі ўдзельнікамі гераічных баёў адбыліся ў многіх гарадах і вёсках рэспублікі. На эстрадах і адкрытых пляцоўках выступалі са святочнымі канцэртамі майстры мастацтваў, калектывы народных тэатраў, самадзейныя спевакі і танцоры. У тэатралізаваных прадстаўленнях уваскрашаліся гераічныя подзвігі савецкіх салдат і афіцэраў у баях за свабоду і незалежнасць Радзімы.

Урачыстасці працягваліся да позняга часу.



**МІНСК, 9 МАЯ. На плошчы Перамогі ля помніка-манумента воінам і партызанам.**



**Курган неўміручасці, насыпаны рукамі людзей у Оршы ў гонар перамогі над фашысцкай Германіяй.**

# Багацці беларускіх тарфянікаў

**На XXIII з'ездзе партыі вялікая ўвага была звернута на далейшае расшырэнне работ па асушэнню пераўвільготненых і забалочаных зямель. І гэта зразумела. Ад іх залежыць рост вытворчасці ўсіх сельскагаспадарчых прадуктаў у зоне нечарназёмных зямель. Беларуская ССР таксама размешчана ў гэтай зоне. Тут дастаткова цеплыні і вільгаці. Ёсць усе магчымасці атрымліваць высокія ўраджаі многіх культур. Але трэцяя частка тэрыторыі рэспублікі занята балотамі і пераўвільготненымі мінеральнымі землямі, прадукцыйнасць якіх вельмі нізкая.**

**Асабліва моцна забалочана паўднёвая частка Беларусі. Толькі ў Палескай нізіне амаль тры мільёны гектараў балот і забалочаных зямель, хоць па кліматычных і прыродных умовах гэты раён асабліва прыгодны для вырошчвання многіх сельскагаспадарчых культур. Але без меліярацыі тут цяжка на штонебудзь разлічваць.**

**Партыя ставіць задачу: у пачаўшымся пяцігоддзі асушыць 6,5 мільёна гектараў пераўвільготненых і забалочаных зямель. Амаль чвэрць іх прыпадае на Беларусь. Акрамя таго, у рэспубліцы трэба будзе раскарчаваць хмызнякі і дробналессе на 900 тысячах гектараў.**

**Меліярацыя выгадна гаспадаркам і дзяржаве. Асушаныя землі хутка апраўдваюць сябе. Перадавыя калгасы і саўгасы рэспублікі з году ў год на вялікіх плошчах асушаных тарфянікаў вырошчваюць высокія ўраджаі: збожжавых — 20—35 цэнтнераў з гектара, бульбы — 250—400, цукровых буракоў — 300—400, кукурузы на сілас — 400—500, канапель (валакна) — 6—7, шматгадовых траў на сена — 40—50 цэнтнераў з гектара.**

**Вось калгас «Зара» Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У мінулым годзе тут сабралі зерня азімых па 25 цэнтнераў з гектара, яравых — па 26, цукровых буракоў — па 300 і сена шматгадовых траў — па 40 цэнтнераў з гектара. У калгасе імя Суворава Любанскага раёна Мінскай вобласці на землях, асушаных з дапамогай ганчарнага дрэнажу, атрымана з гектара: 38,9 цэнтнера азімай пшаніцы, 28,4 азімага жыта, 600 морквы. І гэта не мяжа. На тарфяна-балотных глебах пры ўнясенні дастатковай колькасці фосфарных і калійных угнаенняў можна атрымаць па 40—50 цэнтнераў збожжавых, 400 — бульбы, столькі ж цукровых буракоў, па 100 цэнтнераў сена з гектара.**

**Цяпер у Беларусі больш 1 100 тысяч гектараў асушаных зямель, у тым ліку на 172 тысячах гектараў пракладзен ганчарны дрэнаж. Меліяраваныя землі ў складзе сельскагаспадарчых угоддзяў ужо займаюць 10 працэнтаў. У 1965 годзе меліяратары асушылі і перадалі земляробам 176 тысяч гектараў тарфянікаў і пераўвільготненых зямель. Аб'ём меліярацыйнага будаўніцтва к канцу 1970 года ў Беларусі ўзрасце ў тры разы.**

**У гады новай пяцігодкі шырока разгорнуцца асушальныя работы на буйных балотных масівах Палесся. У бліжэйшы час будуць распачаты меліярацыйныя работы на аб'ектах «Брагінка», «Бобрык», у вярхоўях рэк Ясельды і Паўночнай Случы. Гэта ўнясе карэнныя змены ў сельскагаспадарчую вытворчасць. Рэспубліка дадаткова зможа атрымліваць штогод каля мільёна тон збожжа, звыш двух мільёнаў бульбы, каля 400 тысяч тон гародніны, не менш двух мільёнаў тон сена і многа іншай прадукцыі.**

**А. АЛЯКСАНКІН,**
**міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі Беларускай ССР.**

# ПИШУТ ЗЕМЛЯКИ

*Поздравляю вас с международным праздником труда и весны. Желаю счастья и успехов в новой пятилетке. Я внимательно прочла доклад Л. И. Брежнева на XXIII съезде КПСС и еще раз порадовалась достижениям и планам родного народа.*

*Я русская американка, а это значит, что мои предки жили в России, мои потомки будут жить в Америке. Поэтому больше всего я хочу, чтобы эти две великие державы всегда жили в мире, чтобы все достижения советской и американской науки служили только благу человека.*

*Вера КЛЯЦКО.*
*США.*

***

*Часто накатывались на нашу страну волны вражеских нашествий и каждый раз разбивались о ее незыблемую твердыню. Родная земля, освященная кровью героев! Я рассказываю о тебе своим детям и часто брожу во сне по твоим сосновым борам и березовым рощам.*

*С радостью получаю газету «Голас Радзімы», из которой узнаю о жизни страны. Каждый номер перечитываю по несколько раз. Но вот недавно я прочел статью «От Гутова до Кобрина», и мне захотелось высказать свои замечания. Я родился в Гутове и не могу согласиться с вашим корреспондентом, что мы лишь сидели под пятой белополяков, бедные, лапотные или босые. Народ не сидел, а боролся. Вывешивались красные знамена, горели усадьбы осадников и панов. И я боролся за новую жизнь, и жаль мне, что не довелось ее увидеть.*

*Карп ЗАМКОВИЧ.*
*Канада.*

*ОТ РЕДАКЦИИ: Уважаемый Карп Дмитриевич! Вашу критику редакция считает справедливой и опубликованием Вашего письма исправляет неточность, допущенную в статье «От Гутова до Кобрина».*

# Углы — вёска палеская

У самай глыбіні беларускага Палесся раскінулася вёска Углы. Па тых зменах, якія адбыліся ў гэтым калісьці забытым кутку беларускай зямлі, добра відаць, якое значэнне мае для людзей працы Савецкая ўлада. Як сведчаць старажылы, Углы былі немалым населеным пунктам і да рэвалюцыі. За выключэннем царкоўна-прыходскай школы, за вучобу ў якой прыходзілася плаціць вялікія грошы, не было аніякай грамадскай ці бытавой установы. Да ўрача, а такая патрэба тады ўзнікала вельмі часта, хадзілі пешшу або ехалі на валах за шмат кіламетраў у вёску Дзёрнавічы ці ў Нароўлю.

Пасля гаспадарання фашыстаў ад вёскі Углы, якая пышна расквітнела за даваенны перыяд, засталіся толькі папялішчы і руіны. А цяпер гэта цэнтр адной з буйнейшых у Нараўлянскім раёне гаспадарак — саўгаса «Партызанскі». З дапамогай дзяржавы з кожным годам вёска расце і прыгажэе. У ёй ужо 290 двароў. Толькі летась і сёлета праз Углоўскі сельскі Савет дзяржава выдзеліла на будаўніцтва вёскі 995 кубаметраў лесу. За два мінулыя гады навасел ле справіла 40 сем'яў рабочых.

Тут гаворыць радыё, а па вечарах дамы і вуліцы ярка асвятляюць лямпачкі Ільіча. Ёсць свой фельчарска-акушэрскі пункт, сельмаг, васьмігадовая школа, бібліятэка, клуб на 200 месц, гародніна-сушыльны завод, аддзяленне сувязі, рамонтная тыпавая майстэрня, піларама, швейная майстэрня. Заканчваецца будаўніцтва тыпавога будынка магазіна, 8-кватэрнага жылога дома, закладваецца будынак сярэдняй школы.

Выраслі і людзі. 200 юнакоў і дзяўчат вучацца ва Углоўскай васьмігадовай школе, многія наведваюць Акопскую сярэднюю школу. З ліку жыхароў вёскі 8 чалавек мае вышэйшую адукацыю, 23 — сярэднюю спецыяльную. Сярод іх — урачы, інжынеры, спецыялісты сельскай гаспадаркі. Тут сустрэнеш людзей розных спецыяльнасцей: шафёраў, трактарыстаў, слесараў і газазваршчыкаў, дызелістаў электрастанцыі і г. д.

Заможна і весела жывуць углоўцы. За ўсё гэта яны ўдзячны нашай роднай Савецкай уладзе.

**А. ЧЫГРЫН.**

# УЧАТСЯ ВНУКИ ИВАНА СТОММЫ

Безоблачный май сверкает сотнями солнц в стеклах домов. Навстречу теплу и весне раскрылись широкие окна института иностранных языков, одного из красивейших зданий столицы. Оттуда слышится веселый гул голосов—идет пересменка. Разноцветными стайками взбегают на крыльцо девушки, заботливо прихорашиваются перед зеркальной стеной вестибюля и дальше стучат каблучками по лестницам. Парни, которых здесь меньше (как это обычно бывает в гуманитарных вузах), проходят с достоинством. Однако, несмотря на свою степенность, не могут удержаться, чтобы тоже не бросить на себя взгляд в зеркало.

Те, кто окончил занятия, толпятся у киоска, рассматривая газеты и журналы на английском, немецком, французском, испанском языках. И, как всегда, много читателей возле большой иллюстрированной институтской газеты «Лингвист». В центре газеты фотография танцующей пары и подпись: Изольда Фрольцова и Константин Гарустович — король и королева танцев института.

О Косте Гарустовиче, приехавшем с родителями в Гродно из Аргентины, мы уже рассказывали нашим читателям. Сейчас он студент III курса испанского отделения французского факультета. Славу лучшего танцора гродненского ансамбля «Неман» он привез с собой и в Минск. Однако Костю знают в институте не только как «короля танцев», но и как председателя студенческого комитета общежития, большого активиста и хорошего товарища.

— На вопрос, как меня приняли в Советском Союзе, — говорит Гарустович,—даже трудно ответить. Я забыл, что жил когда-то не здесь, просто чувствую себя дома.

Очень нравятся Косте преподаватели, которые объясняют сложный материал два, три раза, пока каждый студент его не усвоит. Особенно благодарен он Эльзе Ивановне Борисоглебской, дополнительно занимающейся с ним и другими детьми реэмигрантов русским языком.

Не удивительно, что Костя так доволен институтом. Некоторые преподаватели, побывавшие в других вузах страны такого же профиля, утверждают, что минский институт — лучший в Союзе, так как его новое здание, кабинеты, лаборатории наиболее полно отвечают современным методам изучения иностранных языков. Возможно, это утверждение, продиктованное чувством законной гордости и любви к институту, не совсем верно, но несомненно одно: институт действительно один из лучших в стране.

— У нас на факультете очень хорошие преподаватели, — говорит студент IV курса Николай Ленивко. — Богатая литература на испанском языке, встречи в испанском клубе — все это помогает нам глубже овладевать специальностью.

Коля тоже родился в Аргентине; его родители в 1956 году приехали в Барановичи. Там Николай окончил десять классов, там же стал заниматься баскетболом в детской спортивной школе. Со своей командой побывал во многих городах страны. Баскетболист первого разряда Николай Ленивко — член институтской сборной.

Полнокровна и увлекательна студенческая жизнь. Как и многие молодые люди, Коля любит джаз, не пропускает ни одного эстрадного концерта. Курорты, как известно, не по карману студентам. Но для веселых интересных каникул есть и другие возможности. Институт имеет свои спортивные и оздоровительные лагеря в Белоруссии. Вместе с товарищами Николай объехал полстраны: побывал на целине, работал на виноградниках юга, а потом на заработанные деньги совершил экскурсию по всему Крымскому полуострову.

Кроме Гарустовича и Ленивко, на испанском отделении занимаются дети реэмигрантов Григорий Скрипель из Минска (IV курс), Анна Теребей из Новогрудка (III курс), Елена Стомма из Лиды (II курс) и др. Они, как и остальные студенты, получают стипендию, обеспечены общежитием. Кстати, за общежитие студенты платят всего 20 рублей в год.

Весна — пора школьных экзаменов, пора надежд и планов выпускников. На испанскую кафедру уже приходят письма от детей реэмигрантов с просьбой рассказать об условиях поступления в вуз.

— Мы всегда особенно внимательно отвечаем на такие письма, — говорит заведующий кафедрой испанского языка, проректор по научной работе Владимир Васильевич Макаров, — так как учитываем, что эти люди учились в аргентинских школах и перед ними встают дополнительные трудности. Мы советуем им, по каким учебникам нужно готовиться, высылаем списки необходимой литературы. И многие из них поступают и успешно занимаются в нашем институте. Причем мы стараемся всегда пойти им навстречу. Например, Софье Бербеко разрешено заниматься по индивидуальному графику, чтобы сократить срок обучения.

— Оставлена на кафедре старшим преподавателем Анна Дмитриевна Щербакова, окончившая французский факультет. Когда она поступала в институт, у нас еще не было испанского отделения, и этот язык Щербакова изучала как вторую специальность. Первый выпуск испанского отделения состоится в 1967 году, это как раз тот курс, где учится Николай Ленивко. И как обычно, первый выпуск ждет счастливое распределение. Значительная часть его будет оставлена в институте для научной и преподавательской деятельности.

Когда мы разговаривали с преподавателями и студентами института, заходили в его солнечные аудитории, нам вспомнилась одна встреча в Лиде—со старым мастером по ремонту швейных машин Иваном Федоровичем Стоммой. У него большая семья. Старшим детям, выросшим в Аргентине, он не смог дать образования. А теперь он с гордостью говорил о том, что его младшая дочь Елена, внуки Анна и Иван Теребей, окончив школу в СССР, учатся в высших учебных заведениях.

С. КЛИМКОВИЧ,
Т. РЕУТОВИЧ.

# *Петр Щерба:* Я ДОВОЛЕН

В тот день, когда Родина-мать принимала в свою семью новых сыновей и дочерей, люди в Одесском порту говорили о многом. Встречающие рассказывали о своей стране, которая выстояла и победила в трудные для нее годы, говорили об успехах в экономическом и культурном развитии после войны. Приехавшие внимательно слушали слова гостеприимных хозяев, а в голову им то и дело приходила мысль: а как там, в родном городе, родной деревне, откуда они уехали в поисках работы и хлеба.

Вспоминал свои родные Бортники и Петр Щерба. В памяти вставал небольшой клочок земли и большая семья, которая не могла вся уместиться за одним столом и обедала в две очереди. Когда приходилось очень трудно, отец говорил:

— Эх, дети, дети! И как только дальше жить будем? Надо что-то делать. Особенно тебе, Петро. Свою семью уже имеешь, кузнец ты неплохой...

Отцовские слова Петр воспринимал не как укор, а как напоминание о том, что так дальше жить нельзя — голода не миновать. Но в буржуазной Польше малоземельному крестьянину о лучшей жизни приходилось только мечтать. Выход был один—эмиграция. В 1938 году Петр с женой Марией и двумя маленькими детьми Николаем и Анной распрощался со своими Бортниками и поплыл через океан. Сначала Бразилия, потом Аргентина.

В Барановичах, куда семья Щербы приехала на постоянное местожительство, власти предоставили ей квартиру. Петр начал работать кузнецом на заводе автоматических агрегатов, Николая приняли мастером в телевизионное ателье, Анна поступила учиться в Минский медицинский институт.

С тех пор прошло более десяти лет. Петр Алексеевич и его жена Мария Семеновна на заслуженном отдыхе. Государство учло их трудовой стаж в эмиграции и назначило им пенсии. Петр Алексеевич и Мария Семеновна живут в столице нашей республики.

...За окном пышной зеленью распускаются деревья, яркие лучи солнца щедро согревают землю, благоухает весна. Хозяин ведет неторопливый рассказ о прожитых годах, о жизни в Советском Союзе.

